ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі”
А.М. Янкоўская

**ПАЛАЖЭННЕ**

аб правядзенні раённай акцыі
“Гадзіны гістарычнай памяці”

1. **Агульнае палажэнне**
   1.1 Арганізатар акцыі – аддзел бібліятэчнага маркетынгу “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі”.
   1.2 Палажэнне вызначае мэты, задачы, парадак арганізацыі і правядзення акцыі “Гадзіны гістарычнай памяці”.
2. **Мэты і задачы акцыі**
   2.1 Акцыя скіравана на ўзмацненне традыцый народнага адзінства і згуртавання, выхаванне патрыятычнага пачуцця, павагі да гісторыі.
   2.2 Замацаванне ведаў пра дзяржаўныя знакі - сцяг, герб і гімн.
   2.3 Далучэнне да прапаганды традыцый і багатай культуры нашай краіны.
   2.4 Актывізацыя работы бібліятэк па захаванню краязнаўчай спадчыны, гісторыі і культурных традыцый свайго роднага краю.
   2.5 Вывучэнне гісторыі свайго краю, знаёмства з яго гістарычным мінулым і сучасным жыццём.
   2.6 Выхаванне павагі і цікавасці ў чытачоў да духоўнай спадчыны сваёй Радзімы, культурных традыцый роднага краю.
3. **Удзельнікі акцыі**
   3.1 У акцыі прымаюць удзел бібліятэчныя ўстановы ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі”
4. **Умовы і парадак правядзення акцыі**
   4.1 Акцыя праводзіцца на працягу 2021 года.
   4.2 Падвядзенне вынікаў адбудзецца 1 верасня.
   4.3 Этапы правядзення:
      - Збор інфармацыі пра землякоў “Знакамітыя людзі Шчучыншчыны”.
      - Краязнаўчая работа па напісанню летапісу населенных пунктаў і бібліятэк “Люблю свой край, старонку гэту”.
      - Арганізацыя і правядзенне розных мерапрыемстваў, прысвечаных Году народнага адзінства пра гісторыю, сучасны погляд і значнасць падзей, народы Беларусі, аб'яднанне людзей і г. д. на пряцягу года.
   4.4 Матэрыялы прадстаўляюцца ў аддзел бібліятэчнага маркетынгу “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі”.